# “ВЯСНА КРАСНА,

## РАЗВІЦЦЁ ВЫРАЗНАГА МАЎЛЕННЯ ДАШКОЛЬНІКАЎ

*Культура маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту вызначаецца правільным выкарыстаннем усіх моўных адзінак. Акрамя таго, авалоданне моваю прадугледжвае і вывучэнне яе стыляў, якія абслугоўваюць розныя сферы зносін. Найбольш часта ў сваім маўленні дашкольнікі карыстаюцца гутарковым і літаратурна-мастацкім стылямі мовы, вызначальнай камунікатыўнай якасцю якіх з'яўляецца выразнасць. Гаварыць выразна—гэта значыць гаварыць разумна, каб усё сказанае было лёгка спасцігнуць і ўсвядоміць, гэта значыць гаварыць вобразна і прыгожа, каб з дапамогаю своеасаблівага падбору моўных сродкаў уплываць на пачуцці, будзіць эмацыянальныя і эстэтычныя перажыванні. Увогуле, калі для зносін неабходна маўленне, то для культурных зносін, як адзначае А.М. Пяшкоўскі, неабходна “маўленне ў квадраце”, маўленне, што культывуецца як асобае мастацтва.*

*Адным з лепшых сродкаў выхавання выразнага маўлення ў дашкольнікаў з'яўляецца вусная народная творчасць. Яна не толькі вучыць спраўна карыстацца роднай мовай, каб можна было паразумецца з людзьмі, але і развівае ў дзіцяці “дар слова”, які ўключае авалоданне лепшымі формамі мовы, што выпрацаваны на працягу стагоддзяў “як народам, так і літаратурай”. Менавіта ў фальклоры ёсць шмат унікальнага паэтычнага матэрыялу. Ён нібы спецыяльна прызначаны для таго, каб развіваць у дашкольнікаў эстэтычна-мастацкае пачуццё, асобы паэтычны дар, неабходны ім не толькі, каб размаўляць прыгожа і выразна, а і разумець высокае мастацтва слова.*

*Разам з тым вусная народная творчасць з'яўляецца найбольш прыдатным матэрыялам далучэння дзяцей да мастацкіх вытокаў роднай мовы. Творы фальклору ўвасабляюць сапраўдную моўную лабараторыю, у якой нараджаюцца, адпрацоўваюцца і выпрабоўваюцца фанетычныя, лексічныя і сінтаксічныя скарбы нацыянальнай мовы. Вобразныя словы і выразы не толькі ажыўляюць мову фальклору, але і адлюстроўваюць духоўнае багацце народа, які іх стварыў, яго розум, іронію, назіральнасць і глыбокае разуменне чалавечых узаемаадносін.*

*Неабходна адзначыць лепшыя ўласцівасці роднай мовы: самабытнасць, арыгінальнасць, паэтычнасць і мілагучнасць. Яны захаваліся ў фальклоры з выключнай чысцінёй.*

*Дзівосны, поўны незвычайных цудаў і чараў свет, які атуляў чалавека на працягу ўсяго жыцця, не мог быць адлюстраваны ў самым звычайным слове. Ён патрабаваў слова паэтычнага, дакладнага і трапнага, якое б засвяцілася ўсімі колерамі вясёлкі. Стагоддзямі гэта слова шліфавалася і набывала прыгожыя вобразныя формы, уяўляючы сабой узор сапраўднага слоўнага мастацтва. У народзе не толькі назіралі за зменамі, якія адбываліся ў прыродзе, але і ўвасаблялі гэтыя назіранні ў прыгожыя мастацкія слоўныя формы.*

*На кожным кроку сустракаюцца нашы дзеці з дзівосамі, што адбываюцца ў прыродзе. На нашу думку, было б вельмі карысна, каб гэтая сустрэча суправаджалася жывым словам народнай паэзіі: загадкамі, прыказкамі і прымаўкамі.*

*Загадкі—гэта малы жанр фальклору, які часцей за астатнія выкарыстоўваецца выхавальнікамі ў практыцы работы дзіцячага сада. І гэта натуральна, таму што менавіта загадка развівае ў дзяцей паэтыку маўлення і мастацкасць мыслення. Яна дае першыя веды пра метафарычныя багацці роднай мовы. Работа па загадванні і разгадванні загадак можа праводзіцца ў штодзённым жыцці. Пры гэтым неабходна дапамагчы дзецям адчуць мастацкую прыгажосць гэтага паэтычнага жанру.*

*Выхавальнікі дзіцячых садоў у асноўным выкарыстоўваюць загадку ў інтэлектуальна-пазнавальным плане і не заўсёды звяртаюць увагу дзяцей на эстэтычныя якасці яе мастацкага вобраза. Між тым амаль што кожная загадка можа забяспечыць развіццё ў дзяцей эмацыянальна-вобразнага ўспрымання, мастацка-вобразнага мыслення, вобразнасці і выразнасці мовы.*

*Загадкі знаёмяць дзяцей з прыгажосцю мастацкага слова, якое дакладна характарызуе прымету, якасць або рысу прадмета. Так, пры назіранні за лісцем у час лістападу можна загадаць дзецям наступную загадку: “Вісіць—зялёны, ляціць—жоўты, ляжыць—чорны”. Затым спытаць: “Пра што гаворыцца ў загадцы?”, “Як вы здагадаліся, што гэта ліст?”, “Якімі словамі апісваецца ліст у загадцы?”.*

*Мастацкае апісанне ў загадцы рэчаў, з'яў, жывёл дапамагае дашкольнікам лепш зразумець мастацкі вобраз, адчуць яго прыгажосць. Так, перад тым як чытаць забаўку ці казку пра коціка, выхавальнік пры дапамозе загадак можа звярнуць увагу дзяцей на яго вонкавы выгляд:"Калматы, вусаты, есці пачынае, песенькі спявае", “Лёг вусаты, устаў гарбаты”. Пасля адгадвання загадак цікава даведацца ў дзяцей: якія яшчэ прыгожыя словы яны ведаюць пра коціка, ці падобны коцік з загадак на звычайнага, прапанаваць знайсці свае варыянты адлюстравання мастацкага вобраза ў слове.*

*Загадкі дапамагаюць разглядзець рэчы больш дэталёва, знайсці паміж імі падабенства і адрозненні, прыйсці да агульнага выніку і ўвасобіць яго ў слове. Пры гэтым замацоўваюцца веды пра прыметы, якасці, функцыі рэчы. Працэс загадвання і адгадвання загадак дае дзіцяці вялікую эстэтычную асалоду, развівае ў дашкольнікаў мастацкае мысленне, пачуццё гумару, прыгожую вобразную мову.*

*Каштоўным скарбам мастацкасці маўлення чалавека з'яўляюцца народныя прыказкі і прымаўкі. Іх уключэнне ў агульны змест звязнага выказвання робіць апошняе больш выразным і вобразным. Мастацкая мова прыказак вызначаецца і ўдалым эпітэтам, і трапным параўнаннем, і паэтычнай гукавой пабудовай, і дакладнасцю рытму, і мілагучнасцю рыфмы.*

*Работу з прыказкамі і прымаўкамі можна распачаць як на спецыяльных занятках, так і ў працэсе штодзённых зносін дзяцей. Выдатны педагог К.Д.Ушынскі выкарыстоўваў гэтыя сапраўдныя ўзоры слоўнага мастацтва ў якасці маўленчага матэрыялу для развіцця ў дзяцей “дару слова” (моўнай здольнасці).*

*Яркія эпітэты, трапныя параўнанні, паэтычная метафара такіх малых фальклорных форм, як прыказкі, прымаўкі, загадкі, набліжаюць дзяцей да мастацкага ўспрымання рэчаіснасці, робяць іх маўленне вобразным і выразным.*

# ХОЦЬ ГАЛАДНА"

## З ДАПАМОГАЙ МАЛЫХ ЖАНРАЎ ФАЛЬКЛОРУ

*Дзіна ДУБІНІНА,*
*аспірантка кафедры методык дашкольнага выхавання Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М. ТАНКА*

### СТУДЗЕНЬ

#### ПРЫКАЗКІ

**"Студзень—году пачатак, а зіме—палавіна".**

—Пра якую пару года гаворыцца ў прыказцы?

—Якія зімовыя месяцы вы ведаеце?

—Што гаворыцца пра студзень у прыказцы?

—Чаму гаворыцца, што студзень—году пачатак? З якога месяца пачынаецца новы год?

—Чаму сказана, што зіме—палавіна? Назавіце першы, другі і трэці зімовыя месяцы.

**"Зіма на лета працуе, а лета на зіму".**

—Як вы разумееце гэтую прыказку? Якім чынам зіма працуе на лета?

—У народзе раней казалі: *"Снегу навее—хлеба прыбудзе"*. Вось зіма і стараецца, каб болей было снегу. Снег неабходны, каб вырасціць хлеб. Вырасце хлеб, будзе што есці зімой. Таму і працуюць адзін на аднаго зіма і лета.

—Ці ёсць у гэтай прыказцы словы, супрацьлеглыя па сэнсе? Калі ёсць, то назавіце іх.

**"Студзень зямлю студзіць".**

—Пра што гаворыцца ў прыказцы?

—Як пра гэту з'яву можна расказаць словамі, блізкімі па сэнсе? (Студзіць, выстуджваць, марозіць.)

—Чаму так назвалі другі месяц зімы?

**"Зімовая ночка—дзеткам сарочка".**

—Ці доўгая зімовая ночка?

—Ці можна пашыць дзеткам сарочку за зімовую ночку?

—Чаму зімовая ночка параўноўваецца па даўжыні з часам, які траціцца на тое, каб пашыць сарочку?

#### ЗАГАДКІ

**"Без голасу, а вые, без рук, а абрусы сцеле".** *(Завіруха)*

—Пра якую з'яву прыроды гаворыцца ў загадцы? Што зімою завывае і адначасова сцеле снежныя абрусы, але без голасу і без рук?

—Як яшчэ называецца завіруха? (Завея, мяцеліца.)

**"Без рук, без галавы, а маляваць умее".** *(Мароз)*

—Хто малюе прыгожыя зімовыя ўзоры? Якія ўзоры вы бачылі? На што яны падобныя?

**"Сее, вее, рассявае, зімою сляды замятае".** *(Снег)*

—Аб чым гэтая загадка? Якімі словамі, блізкімі па сэнсе, расказваецца пра снег? Раскажыце пра снег прыгожымі словамі. (Белы, пушысты, бліскучы, празрысты, лёгкі, рыпучы, мяккі.)

### ЛЮТЫ

#### ПРЫКАЗКІ

**"У лютым востры мароз — кароткая зіма".**

—Як расказваецца ў прыказцы пра характэрныя прыметы лютага?

—Што можна сказаць пра лютаўскі мароз?

—Якімі прыгожымі словамі можна апісаць зімовыя прыметы гэтага месяца?

**"Віхуры і мяцелі ў лютым палямцелі".**

—Чаму віхуры і мяцелі ў лютым паляцелі?

—Якія прыметы месяца гавораць, што зіма не хоча аддаваць свае правы вясне?

**"Ад лютага зіма збягае цёмнымі начамі".**

—Пра якія зімовыя прыметы гаворыцца ў прыказцы?

—Якія прыметы зімовага дня і ночы вы яшчэ можаце назваць?

**"Люты наробіць плюты", "Пытаецца люты, ці добра ногі абуты".**

—Якія яшчэ прыметы зімовага месяца вы можаце назваць?

—Чаму ў лютым павінны быць ногі добра абуты?

#### ЗАГАДКІ

**"Я з вады народжаны і сам яе раджаю".** *(Снег)*

—Якім чынам снег ператвараецца ў ваду і наадварот? Скажыце, што для гэтага неабходна?

**"Белае палатно, а пад ім халадно".**

—Што ўзімку пакрываецца белым палатном?

—З якімі яшчэ рэчамі снег параўноўваецца ў іншых загадках?

**"На двары гарою, а ў хаце вадою".**

—Пра што гаворыцца ў загадцы?

—Пры якіх умовах снег ператвараецца ў ваду?

**"Са страхі морква вісіць, да зямлі не дастане, паху не мае, зімой вырастае".** *(Лядзяш)*

—Пра што гаворыцца ў загадцы?

—Чаму лядзяш параўноўваецца з морквай?

**"Белы, а не цукар, без ног, а ідзе".** *(Снег)*

—Чаму снег у загадцы параўноўваецца з цукрам?

—Якімі падобнымі па значэнні словамі можна расказаць пра дзеянні снегу? (Снег ідзе.) А яшчэ як можна сказаць? (Падае, ляціць, сцеле, замятае, сее.)

### САКАВІК

#### ПРЫКАЗКІ

**"Сакавік часам снегам сее, а часам сонцам грэе".**

—Пра якую пару года гаворыцца ў прыказцы?

—Якія яшчэ сакавіцкія прыметы вы ведаеце?

**"Сакавік дрэвам сок лускае".**

—Пра якую прымету сакавіка расказваецца ў гэтай прыказцы?

—Якія сакавіцкія прыметы вы самі назіралі?

**"На Саракі пайшла зіма да ракі".** Свята Саракі заўсёды адзначаецца 22 сакавіка.

—Пра што апавядае гэтая прыказка?

—Што стала ў сакавіку са снегам?

**"Прыляцеў кулік з замор'я, вывеў вясну з няволля".**

—Чаму ў народзе кажуць, што птушкі выводзяць вясну з няволі?

#### ЗАГАДКІ

**—"Без ног бяжыць".** *(Вада)*

—Якімі яшчэ словамі можна расказаць аб тым, што робіць вада? (Цячэ, нясецца.)

—Якія яшчэ прыметы, звязаныя з вадой, вы ведаеце?

**"Тонкі, доўгі, а ўпадзе—з травы не ўбачыш".** *(Дождж)*

—Якімі словамі расказваецца ў загадцы пра ўласцівасці дажджу?

**"Вісіць сіта круглавіта, залатое, навітое".** *(Сонейка)*

—Чаму сонейка параўноўваецца ў загадцы з сітам?

**"Даўганосы, даўганогі прыляцеў з далёкай дарогі".** *(Бусел)*

—Аб кім ідзе гаворка?

—Як вы здагадаліся, што гэта бусел?

**"Спераду шыльца, ззаду вільца, наверсе чорнае сукно, падыспадам белае палатно".** *(Ластаўка)*

—Пра каго гаворыцца ў загадцы?

—З чым параўноўваецца грудка і носік ластаўкі? Якога колеру ў яе крылы?

**"Без рук, без сякеры зроблены хата і дзверы".** *(Гняздо)*

—Хто можа пабудаваць такую хатку?

—Як яна называецца?

—Чаму вы лічыце, што гэта гняздо?

## КРАСАВІК

### ПРЫКАЗКІ

**"У красавіку грымот—цёплы будзе год".**
—Якія яшчэ зімовыя прыметы вы ведаеце?

**"Была б красавіцкая вадзіца, а зялёная траўка нарадзіцца".**
—Калі з'яўляецца першая вясновая траўка?
—Якія ўмовы для гэтага неабходны?

**"У красавіку дождж прыходзіць, сонца грэе".**
—Назавіце красавіцкія прыметы, акрамя тых, што ў прыказцы.

**"Вясна красна, хоць галадна".**
—Пра якія прыметы вясны гаворыцца?
—Чаму вясна красна?
—А чаму яна галадна?

### ЗАГАДКІ

**"Маленькае, залаценькае ўсё поле асвеціць".** *(Сонейка)*
—Якімі прыгожымі словамі апісваецца ў загадцы сонейка?

**"Распластала птушка крылы, ажно сонца засланіла".** *(Хмарка)*
—Вы здагадаліся, што гэта?
—З чым параўноўваецца хмарка? Чаму?

**"Вышэй хмарак чырвоная птушка лятае".** *(Сонейка)*
—Чаму птушка чырвонага колеру лятае вышэй за хмаркі?
—Чаму сонейка падобнае на чырвоную птушку?

## МАЙ

### ПРЫКАЗКІ

**"Май—жывёлу ў поле пхай".**
—Аб чым папярэджвае прыказка?
—Чаму менавіта ў маі выганяюць жывёлу на пашу?
—Ці ёсць ужо ў маі трава? Якая яна па памерах, па колеры?
—Чаму май яшчэ называюць траўнем?

**"Май зямлю грэе, а сіверам вее".**
—Ці заўсёды цёпла ў маі?

**"Мокра ў маі—будуць пшанічныя караваі".**
—Што неабходна раслінам, каб яны лепш раслі? (Сонейка і дождж.)

**"Май і пад кустом рай".**
—Дзеці, назавіце майскія прыметы.
—Чаму ў маі і пад кустом рай?

### ЗАГАДКІ

**"Тонкі галасок, доўгі насок".** *(Камар)*
—Дзеці, вы здагадаліся, хто гэта?
—Калі б складалі загадку, што яшчэ сказалі б пра камара?

**"Ляціць, вуржыць".** *(Жук)*
—Як вы здагадаліся, пра каго гаворыцца ў гэтай загадцы?

**"Семсот муляроў зрабілі хатку без вуглоў".** *(Пчолы ці мурашы)*
—Назавіце адгадку.
—Як завецца гэтая хатка?

**"Рос белы шар, падуў вецер, і шар паляцеў".** *(Дзьмухавец)*
—Аб чым гаворыцца ў загадцы?
—Чаму кветачка завецца дзьмухавец?

**"Зялёная, а не луг, белая, а не снег, кучаравая, а без валасоў".** *(Бяроза)*
—Ці здагадаліся вы, аб чым загадка?
—Якія прыметы бярозкі тут падкрэслены?

## ЧЭРВЕНЬ

### ПРЫКАЗКІ

**"Людзі рады лету, а пчолы квету".**
—Дзеці, чаму людзі рады лету, а пчолы квету?

**"Чэрвень не гуляе—ураджай люляе".**
—Як вы разумееце слова "люляе"?
—Як люляе ўраджай чэрвень?
—Якія змены ў прыродзе, што адбываюцца ў гэтым месяцы, спрыяюць добраму ўраджаю?

**"Лета на зіму, а зіма на лета працуе".**
—Дзеці, растлумачце, як лета працуе на зіму?

**"Благое лета, калі сонца нету".**
—Чаму дрэнна, калі летам няма сонейка?
—Каму патрэбна сонейка летам?

### ЗАГАДКІ

**"Сіняя дзяжурка ўвесь свет накрыла".** *(Неба)*
—Чаму неба параўноўваецца ў загадцы з сіняю дзяжуркай?

**"Не стучыць, не гручыць, у акенца глядзіць".** *(Дзень)*
—Калі вы прачынаецеся, якая пара сутак на дварэ?
—Па якіх прыметах вы здагадаліся?

**"Хоць ён побач, а рукамі не возьмеш".** *(Цень)*
Вельмі добра яго можна ўбачыць у ясны сонечны дзень.
—Чаму цень нельга ўзяць рукамі?

**"Не сучок, не лісток, не краска, а на дрэве расце".** *(Кара)*
—Пра што гаворыцца ў загадцы?
—Якія дрэвы вы ведаеце?
—Якога колеру бывае кара ў дрэў?

**"Сядзіць паненачка ў чырвонай сукеначцы, хто ідзе, дык пакloніцца.** *(Суніца)*
—Ці ведаеце вы адгадку?
—Якія яшчэ ягады маюць чырвоную сукеначку?

**"Было жоўтым, вырасла зялёным, сонца пацалавала, зноў жоўтым стала".** *(Жыта)*
—Ці вядома вам, пра што гэта загадка?
—У якія поры года жыта выглядае па-рознаму?

## ЛІПЕНЬ

### ПРЫКАЗКІ

**"Ліпень пякучы, але даручы".**
—Пра якія ліпеньскія прыметы гаворыцца ў прыказцы?
—Чаму пра ліпень кажуць, што ён пякучы?
—А чым ён усіх адорвае?

**"Ліпень косіць і жне, доўга спаць не дае".**
—Пра якія працоўныя дзеянні, што выконваюцца ў ліпені, гаворыцца ў прыказцы?
—Чаму ліпень не дае доўга спаць?

### ЗАГАДКІ

**"Не агонь, а пячэцца".** *(Крапіва)*
—Якая расліна пячэцца як агонь?
—Што яшчэ вы ведаеце пра гэтую расліну?

**"Ляжыць сярод градкі зялёны і гладкі".** *(Агурок)*
—Ці вядома вам гэта агародніна?
—Якімі яшчэ словамі можна расказаць пра прыметы агурка?
Складзіце сваю загадку пра агурок.

**"Чырвоны колер, вінны смак, каменнае сэрца".** *(Вішня)*
—Якімі прыгожымі словамі апісваецца вішня?

**"Румяны Піліп да палкі прыліп".** *(Яблык)*
—Раскажыце пра яблык, які ён?
У загадцы гаворыцца, што ён румяны, а яшчэ які бывае?

**"Чырвоная шапка—белая галоўка".** *(Маліна)*
—Прыпомніце, у якой ягадкі белая галоўка?

## ЖНІВЕНЬ

### ПРЫКАЗКІ

**"Кожная хата ў жніўні багата".**
—Растлумачце, чаму ў жніўні кожная хата багатая?

**"У жніўні ночка доўгая, вада халодная, яблыкамі пахне".**
—Якія яшчэ жнівеньскія прыметы вы ведаеце?

**"Што поле ўродзіць, жнівень знаходзіць".**

—Дзеці, які ўраджай знаходзіць жнівень на полі?

**"Жнівень жне і косіць—на сталах багацця досыць".**

—Складзіце невялічкае апавяданне да гэтай прыказкі.

### ЗАГАДКІ

**"Сядзіць бабка на градках, уся ў заплатках, хто ні гляне, усякі заплача".** *(Цыбуля)*

—Як вы здагадаліся, што гэта цыбуля?

**"Лата на лаце і шва не знаці".** *(Капуста)*

—Якую агародніну нагадвае вам гэта загадка? Чаму?

**"Чырвоная, ды не дзеўка, зялёная, ды не дуброва".** *(Морква)*

—Пра якую агародніну гаворыцца ў загадцы?

—З чым параўноўваецца морква і чаму?

**"Круглая, ды не гарбуз, з хвастом, ды не мыш".** *(Рэпа)*

—Якая агародніна параўноўваецца ў загадцы з гарбузом і мышшу і чаму?

## ВЕРАСЕНЬ

### ПРЫКАЗКІ

**"Халодны верасень, але сыты".**

—Якія яшчэ прыметы гэтага месяца вы ведаеце?

**"Як настаў верасень, дык туман кожны дзень".**

—Якія яшчэ змены адбыліся ў прыродзе?

**"У верасні ліст на дрэве не трымаецца".**

—Чаму ліст на дрэве не трымаецца менавіта ў верасні?

**"Восень кажа "ўраджу"—вясна кажа "яшчэ пагляджу".**

—Чаму так разважаюць поры года?

### ЗАГАДКІ

**"Ляцеў пан, на ваду паў, вады не ўзмуціў".** *(Ліст)*

—Што такое лёгкае можа ўпасці на ваду, каб яна нават і не ўскалыхнулася?

**"Насупіцца, нахмурыцца, у слёзы ўдарыцца—нічога не застанецца".** *(Хмарка)*

—Што нагадвае вам гэтая загадка?

—Якімі словамі, падобнымі па сэнсе, расказваецца пра дзеянні хмаркі?

**"Фыркае, рыкае, галіны ламае, пыл падымае, цябе з ног збівае, чуеш яго, ды не бачыш".** *(Вецер)*

—Як вы здагадаліся, што гэта вецер?

**"На рэках, на водах, на ракавых клюшнях стаіць двор хлебны, усяму свету патрэбны".** *(Млын)*

—Ці вядома вам, пра што гаворыцца ў загадцы?

—Як вы здагадаліся?

**"З неба крупы падаюць".** *(Град)*

—Пра якую з'яву прыроды ідзе гаворка ў загадцы?

—Што гэта за крупы падаюць з неба?

## КАСТРЫЧНІК

### ПРЫКАЗКІ

**"Кастрычнік ходзіць па краю, гоніць птушак з гаю".**

—Калі пачынаюць адлятаць птушкі ў вырай?

—Якія птушкі адлятаюць першымі, якія крыху пазней?

**"Кастрычнік зямлю балоціць, а лес залоціць".**

—Якія яшчэ прыметы восені вы заўважылі ў кастрычніку?

**"Восень на рабым кані ездзіць".**

—Чаму, як вы думаеце?

—Яшчэ ў народзе кажуць, што ўвосень бывае то снег, то слата (такая чорная грэзь), вось і ездзіць восень на рабым кані.

**"Лета прагуляеш—восенню не сабярэш".**

—У якіх яшчэ творах расказваецца пра тое ж, што ў прыказцы? Назавіце іх.

### ЗАГАДКІ

**"Кругленькае, беленькае, усяму свету міленькае".** *(Сонейка)*

—Што нагадвае вам загадка?

—А якое сонейка ў кастрычніку?

—Ці гарачае яно? Чаму?

**"Стаіць дзед пры дарозе на адной назе".** *(Грыб)*

—Якія лясныя дары маюць адну нагу?

—Назавіце грыбы, якія вы ведаеце.

**"Вісіць—зялёны, ляціць—жоўты, ляжыць—чорны".** *(Ліст)*

—Аб чым гэта загадка?

—Якім яшчэ бывае ліст восенню?

**"Усе паны паскідалі жупаны, толькі двое ў жупанах стаяць".** *(Сасна, елка)*

—Назавіце дрэвы, якія застаюцца на зіму зялёнымі.

**"Цар багаты, ды птушкі не пяюць, царэўна бедная, але птушкі пяюць".** *(Восень, вясна)*

—Пра якія поры года гэтая загадка?

—Калі пачынаюць спяваць птушкі?

—Калі яны заканчваюць спяваць свае песні?

—Чаму цар (восень) багаты?

—Чаму царэўна (вясна) бедная?

## ЛІСТАПАД

### ПРЫКАЗКІ

**"У лістападзе гола ў садзе".**

—Як выглядаюць дрэвы ўвосень?

**"Лістапад зіме сцежку пракладае".**

—Растлумачце, чаму так гавораць?

—Якія змены адбываюцца ў прыродзе ў лістападзе?

**"Увосень за стол просім".**

—Чым так багата восень?

### ЗАГАДКІ

**"Хоць зубоў не мае, а за твар балюча кусае".** *(Мароз)*

—Дзеці, як вы думаеце, што гэта?

—Чаму вы лічыце, што гэта мароз?

**"Без рук, без ног, а кветкі малюе".** *(Мароз)*

—Вам вядома адгадка?

—Што яшчэ малюе мароз?

**"На вадзе радзіцца, а вады баіцца".** *(Лёд)*

—Аб чым гэта загадка?

—У што ператвараецца вада, калі моцны мароз?

—Ці баіцца лёд вады? Давайце паглядзім. (Можна правесці доследы.)

**"Ляцяць птушкі без крыл, а садзяцца без ног".** *(Снег)*

—Пра што апавядаецца ў загадцы?

—Што зімою лётае ў паветры без крылаў і ног?

—Чаму снег параўноўваецца з птушкай без крылаў?

## СНЕЖАНЬ

### ПРЫКАЗКІ

**"Снежань зіму пачынае, а год канчае".**

—Дзеці, чаму так адбываецца?

**"Снежань зямлю грудзіць, хаты студзіць".**

**"У снежні мароз і снег вышэй хаты—будзе год багаты".**

—Як расказваецца ў прыказках пра зімовыя прыметы?

**"Снежань сцюжны, з зімою дружны".**

—Што цікавага вы заўважылі ў гэтым зімовым месяцы?

**"Снежань вока снегам слепіць ды марозам вуха рве".**

—Пра якія снежаньскія прыметы гаворыцца ў прыказцы?

—Ці многа снегу ў снежні? Чаму месяц завецца снежань?

—Ці моцны ў снежні мароз?

### ЗАГАДКІ

**"Цякло, цякло і схавалася пад шкло".** *(Вада)*

—Аб чым расказваецца ў загадцы?

—Раскажыце, якім бывае ледзяное шкло.

**"Без рук, без сякеры, а масты будуе".** *(Мароз)*

—Вы здагадаліся, аб чым загадка?

—З чаго будуе масты мароз?

**"Ляціць, а не птушка, вые, а не звер".** *(Вецер)*

—Што можа лятаць, як птушка, і завываць, як звер?

—Чаму ветрык параўноўваецца з птушкай і зверам?